**Шапавалава, А.** На сэрцы – незагойная рана Афгана / А. Шапавалава // Пастаўскі край. — 2015. — 14 лют. — С. 5.

# НА СЭРЦЫ – НЕЗАГОЙНАЯ РАНА АФГАНА



***Кожны новы год усё больш аддаляе ад нас афганскую вайну. Усё далей у гісторыю адыходзяць тыя падзеі, старэюць воіны-інтэрнацыяналісты. Але колькі б часу ні прайшло, яны да драбніц будуць памятаць свае вогненныя камандзіроўкі і вельмі неахвотна пра іх расказваць: надзвычай балючыя душэўныя раны засталіся. Вось і пастаўчанін Анатолій Васільевіч Голад доўга не згаджаўся на інтэрв'ю. А калі ўрэшце ўдалося яго ўгаварыць – раз за разам стараўся перавесці размову на іншае.***

У Афганістан А. В. Голад трапіў у студзені 1981-га разам з 292-ім Асобным верталётным палком па агнявой падтрымцы, які дыслацыраваўся ў Паўднёвай Асеціі, горадзе Цхінвал. На той час Анатолій Васільевіч быў ужо ў званні маёра і займаў пасаду намесніка камандзіра палка. Меў таксама сям'ю – жонку і двух сыноў. Тым не менш паведамленне аб адпраўцы ў небяспечную камандзіроўку ўспрыняў спакойна.

– Мяне гэта не напалохала, як і амаль кожнага ў нашым палку, – кажа ён сёння. – У ім не было баязліўцаў, наадварот, усе вельмі смелыя і адказныя людзі. Я ганарыўся імі.

На самалётах АН-22 292-гі полк перавезлі з Грузіі ва Узбекістан, на ваенны аэрадром Какайды, што за 40 кіламетраў ад Тэрмеза. Там вайскоўцы прывялі свае верталёты ў баявы стан і самастойна пераляцелі ў Кундуз. А адтуль праз месяц перабазіраваліся ў Джалалабад, што на граніцы з Пакістанам. У Джалалабадзе, па словах А. В. Голада, і пачалася «сапраўдная афганская работа». Кожны дзень савецкія верталётчыкі падымаліся ў 3 гадзіны ночы, бо ўжо ў маі ўсталявалася невыносная спёка, і ажыццяўлялі баявыя вылеты на месцы, а таксама ў Гардэз і Газні.

– Наш аэрадром ахоўвала па перыметры дэсантна-штурмавая брыгада, – успамінае ветэран. – Душманы шмат разоў рабілі спробы захапіць яго. Аднойчы адбіваліся ад іх каля двух сутак. Мы пастаянна насілі пры сабе заражаныя пісталеты, каб у крайнім выпадку застрэліцца і не трапіць у палон, бо ведалі, як «духі» абыходзяцца з савецкімі салдатамі і афіцэрамі.

Баі з душманамі ішлі ў цяснінах на ўсёй працягласці ад пакістанскага Пешавара да аэрадрома, які перашкаджаў баевікам завалодаць тэрыторыяй і аб'ектамі за ім. У маі 1981 года пачалася самая доўгая баявая аперацыя, якая закончылася глыбокай восенню. У выніку яе ў кожнай роце дэсантна-штурмавой брыгады засталося па 12-20 байцоў. Значныя страты за паўтара года знаходжання ў Афганістане панёс і верталётны полк: амаль 60 чалавек з яго былі адпраўлены дамоў «грузам-200».

А. В. Голад вярнуўся ў Цхінвал кавалерам ордэна Чырвонай Зоркі. Праз год Анатолія Васільевіча накіравалі ў Германію, дзе праслужыў 5 гадоў і атрымаў званне падпалкоўніка. А ў лістападзе 1987-га ён прыехаў служыць у Паставы. Тут праз некаторы час выйшаў у запас, але сядзець дома не стаў. Пакуль дазваляла здароўе, працаваў ва УП ЖКГ начальнікам участка кацельняў і цепласетак раёна, узначальваў раённую арганізацыю ветэранаў вайны ў Афганістане. Як і іншыя воіны-інтэрнацыяналісты, часта выступаў перад вучнямі СШ № 3 і № 1, расказваў пра баявое мінулае падлеткам са свайго дома. Цяпер робіць гэта ўсё радзей, каб не трывожыць лішні раз хворае сэрца, на якім ніколі не загоіцца афганская рана.

**Алена Шапавалава**